■ Выпрабавана на сабе

# АДШУКАЦЬ ДРУГУЮ ПАЛАВІНКУ. ХУТКА

**Прызнаюся шчыра: да «хуткіх спатканняў» я ставілася досыць скептычна. У штучна створаных умовах збіраюцца людзі (няўжо нельга пазнаёміцца як-небудзь інакш?) і спрабуюць зразумець за лічаныя гадзіны, ці падыходзіць ім той ці іншы чалавек. Навошта? Я не раз чула гісторыі, як знаёміліся ў метро, на днях народзінаў, нават у інтэрнэце, і пасля браліся шлюбам і жылі доўга і шчасліва. Але каб на хуткіх спатканнях... У працяг нашай гутаркі з Аксанай Чырко, мінскай сваццяй («Сямейная газета» за 28.04.2016), мы наведалі адну з такіх сустрэч, якую яна арганізоўвае штомесяц, і паспрабавалі вызначыць, ці сапраўды такім шляхам можна адшукаць «свайго» чалавека.**

## КРОК ПЕРШЫ: ПАДРЫХТОЎКА

Я ўпэўнівала сябе, што гэта па працы і напружвацца не варта. Але нядзельны час, скрадзены ў праполкі градак на бацькоўскім лецішчы, усё адно трэба было скарыстаць. Таму зборы — хаджэнні па ўсіх кругах перадспаткальнага «пекла» — пачаліся ўжо за тры гадзіны. За гэты час я адчула сябе галоўнай гераіняй кліпа «Экспанат» групоўкі «Ленінград», які абляцеў інтэрнэт-прастору ў апошнія месяцы. Прычоска, манікюр (якому звычайна ўвагі надаецца найменш), макіяж... Праўда, шукаць лабутэны мне не прыйшлося: што надзець і абуць, прыдумала загадзя.

## КРОК ДРУГІ: ЛАМАННЕ СТЭРЭАТЫПА

Мне заўжды падавалася, што на хуткія спатканні прыходзяць тыя, у каго ёсць пэўныя перашкоды ці праблемы ў зносінах з супрацьлеглым полам. Але гэтае ўяўленне не спрацавала. Я спецыяльна прыйшла загадзя і з цікавасцю разглядзела ўдзельнікаў. Відавочна, што ў большасці з іх не было тых трох вольных гадзін на малапатрэбную падрыхтоўку, як у мяне. Бо на сустрэчу, па-першае, прыйшлі людзі, у якіх складваецца паспяховая кар'ера і ім нязвыкла сядзець на месцы, і, па-другое, гэта тыя, хто не толькі добра працуе, але і на шырокую нагу адпачывае. Напрыклад, Канстанцін, які займае кіраўнічую пасаду, у сезон катаецца з альпійскіх вяршыняў на лыжах і сноўбордзе, у міжсезонне — у Мінску на каньках. Лізавета, якая займаецца продажамі, — гурманка, для яе згатаваць суп гаспача, ялавічыну па-бургундску ці мексіканскае бурыта — звычайная справа. Большасць удзельнікаў даязджалі на спатканні на працягу гадзіны ад пачатку, бо былі занятыя па працы ці актыўна адпачывалі.

**На мерапрыемства прыйшлі тыя, хто відавочна шукаў не хуткую інтрыжку, а партнёра для будучых адносін. Таму мужчыны адкрыта пыталіся пра погляды на стварэнне сям'і.**

На сустрэчу ў выніку прыйшло 12 чалавек (6 жанчын і столькі ж мужчын). Трэба адзначыць, што ўсе яны былі відавочна старэйшыя за мяне і, мабыць, сярэдні ўзрост складаў гадоў 28-30. Прычым жанчыны — розных прафесій, але ўсе як адна прывабныя і, што самае галоўнае, цікавыя ды разумныя. Мужчыны адрозніваліся значна больш — завіталі і дызайнеры, і журналісты, і бізнесмены, і праграмісты, — былі старэйшымі за жанчын-удзельніц.





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## КРОК ТРЭЦІ: НЕПАСРЭДНА ЗНАЁМСТВА

У памяшканні было расстаўлена шэсць столікаў з двума крэсламі кожны. За столікам — пара з мужчыны і жанчыны. Першае наша заданне было паспрабаваць адгадаць, якія ў твайго візаві прафесія, характар, любімая страва, колькі сясцёр і братоў. Вядома, што адгадваць не надта атрымлівалася, таму суразмоўцу, як і мне самой, даводзілася расказваць пра сябе. Дарэчы, 4 з 6 сказалі, што я — настаўніца малодшых класаў. Прыкладна кожныя 15 хвілін мужчыны пераходзілі да наступнага століка, за мой садзіўся іншы чалавек, і мы пачыналі гутарку наноў.

**Тут сабраліся людзі, у якіх, па-першае, складваецца паспяховая кар'ера і ім нязвыкла сядзець на месцы, і, па-другое, гэта тыя, хто не толькі добра працуе, але і на шырокую нагу адпачывае.**

Гэтак прайшло першае кола. Аказалася, што сядзець і ўважліва слухаць недастаткова. Мне, з любоўю да тэатра, чытання і вырошчвання кветак на лецішчы, было цяжка «супасці» з аматарамі экстрэмальных відаў спорту, атэістамі ці тымі, хто верыць у тэорыі агульнага Бога і касмічных духоўных хваляў. Тым не менш былі і калегі, выпускнікі Інстытута журналістыкі, з якімі агульных тэм для размоў знайшлося як расы. На наступным «коле», калі ізноў за мой столік сеў першы суразмоўца, мы гутарылі, толькі ўжо тэматычна, а на апошнім — на любую вольную тэму. Напрыканцы, калі ўжо пайшла чацвёртая гадзіна сустрэчы, мы пачалі гуляць у штосьці накшталт кракадзіла. Па словах свацці, характар сустрэчы (больш гутарак ці больш гульняў) залежыць ад таго, якія ўдзельнікі падабраліся. У нашым выпадку — досыць сталыя і сур'ёзныя. Таму акцэнт быў зроблены менавіта на размовы.

## ЗАМЕСТ ПАСТСКРЫПТУМА

Магу сказаць адно: час я правяла прыемна. На мерапрыемства прыйшлі тыя, хто відавочна шукаў не хуткую інтрыжку, а партнёра для будучых адносін. Таму мужчыны адкрыта пыталіся пра погляды на стварэнне сям'і. Вернікі — пра Бога, правыя — пра палітычныя погляды, калегі — пра тое, як пажываюць у інстытуце выкладчыкі, некаторыя ўдзельнікі — нават пра тое, як я стаўлюся да інтымных зносін... Склалася адчуванне, што цябе акуратна «мацалі» на погляды, інтарэсы і каштоўнасці і спрабавалі адшукаць тое агульнае, што дапаможа завязаць будучыя адносіны. Але ўзроставая розніца была занадта адчувальнай, таму, без асаблівага разліку на будучыню, я атрымлівала асалоду ад размоў тут і цяпер.

Напрыканцы сустрэчы кожны з удзельнікаў аддаваў свацці картку сімпатый, у якой насупраць кожнага імя мужчыны ці жанчыны можна было паставіць адну з адзнак — сэрцайка (значыць, ён спадабаўся і хочаш працягнуць адносіны) ці смайлік (для сяброўства). У рамантычным плане мне спадабаўся толькі адзін з удзельнікаў, і адзін здаўся цікавым для сяброўства. Што тычыцца апошняга — мы супалі. Але з першым, на жаль, не. Па словах Аксаны Чырко, усяго адбылося пяць супадзенняў для будучых адносін, і чатыры — для сяброўства.

Самае галоўнае — дзякуючы спатканням мне давялося выйсці з зоны камфорту. Бо людзі, якія маюць па дзве вышэйшыя адукацыі, некалькі разоў за жыццё мянялі спецыяльнасць, прачыталі значна больш кніг, наведалі куды больш краін, нагадалі мне, што выйсці замуж, гэта, вядома, важна. Але наперадзе столькі нязведанага і цікавага... нашто спяшацца?

**Веранiка ПУСТАВІТ.**

*pustavit@zviazda.by*

*Імёны ўсіх удзельнікаў хуткіх спатканняў зменены*

■

■ Вазьму твой боль...

# ЖЫЦЦЁ ПІША НАЙЛЕПШЫ СЦЭНАРЫЙ




**Мы самі любім ствараць ілюзіі. Верым у тое, у што хочам верыць. І адмаўляемся ведаць тое, што і без таго ведаем. Мы закладнікі ўласных поглядаў і жаданняў.**

Аднойчы, распытваючы пра дзейнасць дабрачыннага «Клуба 5000», журналістка папрасіла мяне: «Чытала, што вы былі сведкай некаторых гісторый кахання паміж падлеткамі ў анкацэнтры. Раскажыце пра іх». Ёй вельмі хацелася пачуць прыгожы расповед пра рамантычныя пачуцці, здольныя змяніць няземнае. Мне таксама хацелася падзяліцца такой гісторыяй. Вельмі хацелася. Але я набралася мужнасці і адмовілася. Бо ў рэальнасці гэта сумныя гісторыі. З такімі ж бытавымі праблемамі, як у нас з вамі, з такімі ж сваркамі, ахвярамі, з такімі ж інтрыгамі і расчараваннямі. Толькі з іншым фіналам. Часта банальна прадказальным. Там кропка канчатковая. Пункт незвароту. Сапраўдны канец.

Мы рамантызуем такія гісторыі. Пісьменнікі аздабляюць іх, прыфарбоўваюць. І незаўважна звычайная гісторыя адносін пераўтвараецца ў размаляваную слязлівую аповесць, дапаможнік для ўсіх закаханых.

Мы, журналісты, таксама грашым схільнасцю прыхарошваць рэчаіснасць. Нам здаецца, што парачка штучных зялёных лісточкаў не зменіць сутнасці, але надасць сакавітасці. Пары лісткоў аказваецца недастаткова — далучаюцца цэлыя галіны, дадаюцца пластыкавыя кветкі, складаюцца штучныя букеты. І мы аздабляем, адразаем лішняе, падганяем па форме, упісваем у каноны.

У клубе была падапечная, прыгожая маладая дзяўчына. Хвароба прынесла ёй шмат пакут. Паказала несправядлівасць, нявернасць, чалавечую гнілату. Крыўды, расчараванні. Найлепшыя кавалеры, з-за якіх ёй зайздросцілі іншыя дзяўчаты, раптам адвярнуліся. Алена разгубілася і больш не разумела, каму патрэбная, а для каго цяпер няважная.

І тут пад шумок з'явіўся ён. Не, не прынц, зусім не прынц. Звычайны вясковы хлопец. Пры іншых абставінах яна, прыгажуня, і не зірнула б на яго. А тут перагледзела свае прыярытэты, ацаніла клопат. Адказала на рамантычную прапанову і, не адкладаючы, пачала збірацца замуж.

Прыгожую гісторыю кахання цяжка хворай дзяўчыны і адданага хлопца падхапілі СМІ. Людзі натхняліся, дзякавалі, зычылі маладым шчасця.

Толькі за кадрам засталося тое, што клапатлівы малады дужа піў і часта сварыўся са сваёй прыгажуняй, моцна засмучаў яе. У агульнай заміласанасці ніхто не звярнуў увагі і на юнацкі Аленін адчай. Ёй вельмі хацелася кахаць і быць каханай. Ёй даводзілася прызвычайвацца да новых умоў і абмежаванняў. Яна адчайна шукала паветра, пачуццяў, разумення. Хоць заўсёды з аптымізмам глядзела ў будучыню, думаю, падсвядома, яна баялася не паспець. Таму спяшалася. І таму заплюшчвала вочы на гарэлку, безадказнасць і абразы.

Гэты абзац не ўпісваецца ў канцэпцыю бездакорнай гісторыі кахання. Мы скарацілі яго, выкінулі, не заўважылі, выкраслілі з памяці і сцёрлі з гісторыі. Мы робім так з усім, што не ўпісваецца ў рамкі, намі ж самімі і створаныя.

Часам едзеш на інтэрв'ю з ужо падрыхтаванай схемай эфірнага сюжэта. Так ты пачнеш, потым дасі сінхрон, далей падводку да праблемы, у гэтым месцы герой павінен расказаць пра гэта, а ў наступным — пра тое. Прыязджаеш, пачынаеш гутарку — і ўсе твае планы разбураюцца, як картачны дамок. Суразмоўца выходзіць на такія аспекты тэмы, на такія эмоцыі і развагі, пра якія ты нават не падазраваў. Ён не ўпісваецца ў тваю канцэпцыю. Ды і канцэпцыі больш няма. Ты разумееш, што жыццё піша найлепшыя сцэнарыі.

Я люблю дакументальныя фільмы Андрэя Куцілы. Там кожная сцэна пастаўлена жыццём. Пастаўлена бездакорна. Ты акунаешся ў яе і разумееш, што ніводзін рэжысёр, нават самы выдатны, не даб'ецца ад самага таленавітага акцёра такога моманту. Ніводны залатарукі дэкаратар не зробіць такой карцінкі, як само жыццё. Толькі не стварайце яму рамкі, не абмяжоўвайце канцэпцыямі. Проста назірайце і фіксуйце. Жыццё не падуладнае нам, не падладжваецца пад нашы патрэбы. Гэта мы падпарадкоўваемся яму. І калі скарыцца, даверыцца і прыняць гэта, то ўпісацца ў яго даволі проста.

Што да герояў гісторый кахання, яны не паспелі пажаніцца. Адданы жаніх і праз некалькі гадоў пасля страты Алены абражае тых, хто захоўвае яе памяць. А па інтэрнэце гуляе кранальны сюжэт пра тое, як дзіўнай прыгажосці смяротна хворая дзяўчына і клапатлівы хлопец з дапамогай кахання пераадольвалі наканаванае.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■